стве. Прымаў удзел у падрыхтоўцы збору твораў М.Багдановіча (т. 1—2, 1927—28).

*Тв.*: «Матчын дар» А.Гаруна. Мінск, 1928; Паэтыка: курс для завочнага педфаку. Мінск, 1929—30.

**БА́РЫШАЎ** Гурый Іларыёнавіч (30.4. 1928, г. Ташкент — 14.6.2001), беларускі тэатразнавец, мастацтвазнавец, педагог. Д-р мастацтвазнаўства, праф. (1990). Скончыў Ташкенцкі тэатр. ін-т (1950). У 1955—67 і 1973—78 працаваў у Ін-це мастацтвазнаўства, этнаграфіі і фальклору АН Беларусі, адначасова з 1961 у Бел. тэатр.-маст. ін-це, у 1967—73 у Гал. рэдакцыі БелСЭ. З 1979 у Бел. ун-це культуры. Даследаваў гісторыю і тэорыю бел. прафес. і нар. тэатра, тэатр. культуру Беларусі 18 ст., сцэнаграфію. Аўтар манаграфій «Тэатральна-дэкарацыйнае мастацтва Савецкай Беларусі» (1958), «Тэатральная культура Беларусі XVIII стагоддзя» (1992), раздзелаў у кн. «Гісторыя беларускага тэатра» (т. 1, 1983), «Музычны тэатр Беларусі: дакастрычніцкі перыяд» (1990), п'есы «Цар Ірад» (1993) і інш.

*Тв.*: Батлейка. Мінск, 2000.

*Літ.*: П и с к у н Н.Д. Гурий Илларионович Барышев [1928—2001] — ученый, учитель, человек // Муз. і тэатр. мастацтва: праблема выкладання. 2008. № 3.

**БАРЭЛЬЕ́Ф** (франц. bas-relief, літар. нізкі рэльеф), скульптурная выява на плоскасці; від рэльефу, пры якім выява выступае над плоскай паверхняй фону не больш, чым на палову свайго сапр. аб'ёму. Ствараецца з дапамогай тэхнік ліцця, чаканкі, разьбы, высякання, лепкі і інш. Выкарыстоўваецца ў аздабленні вырабаў дэкар.-прыкладнога мастацтва (рамы алтарных карцін і абразоў, іх аправы, упрыгажэнні, посуд, кафля, медалі, манеты і інш.), манумент.-дэкар. скульптуры і мемар. пластыцы. У Б. адлюстроўваюцца партрэты, гіст. і рэліг. сюжэты, геральдычныя, геаметрычныя і раслінныя матывы. У Беларусі



*Барэльеф у сучасным інтэр'еры.*

вядомы з 10 ст. (выява Яраполка Святаславіча на падвяснай пячатцы). Пашырыліся з часоў высокага сярэдневякоўя (амулет-змеявік з Ваўкавыска, 12 ст.) і Адраджэння (кафля з адлюстраваннем скамароха з Полацка, 15 ст.; медалі з партрэтамі членаў сям'і Сігізмунда I Аўгуста, каралевы Боны Сфорца, 16 ст.). У 17—18 ст. Б. распаўсюдзіўся ў аздабленні апраў евангелляў, імшалаў, рыз алтарных карцін, печаў, надмагілляў («Евангелле» з Мікалаеўскай царквы ў г.п. Урэчча Любанскага р-на; «Мшал» з касцёла Найсвяцейшай Дзевы Марыі ў в. Вялікія Эйсманты Бераставіцкага р-на; рыза алтарнай карціны «Маці Божая з дзіцем» з *Камайскага касцёла Яна Хрысціцеля*; печы з палаца ў Нясвіжы; надмагілле кн. М.К.Радзівіла Сіроткі ў касцёле Божага Цела ў Нясвіжы). У 19 ст. Б. стваралі К.Ельскі (аздабленне калоннай залы Віленскага ун-та), Р.Слізень (Б. Г.Ржавускага, Т.Зана), А.Скірмунт (медаль з выявай І.Цэзара), у 20 — пач. 21 ст. — З.Азгур, А.Бембель, А.Глебаў, Л. і С. Гумілеўскія, А.Зіменка, Я.Колчаў, С.Селіханаў, У.Слабодчыкаў, Л.Талбузін, А.Фінскі, А.Чыгрын, А.Шатэрнік і інш. *Ю.Ю.Захарына.*

**БАС** (італьян. basso, літар. нізкі), 1) самы нізкі мужчынскі голас. Вылучаюць Б. высокі, або пявучы, і нізкі, або глыбокі, у оперы таксама характарны, камічны буфонны Б. Высокі Б. бывае лірычны, больш мяккі, з дыяпазонам $G—f^1$, і драм., больш моцны, з дыяпазонам $A—e^1$. Для высокага Б. характэрны сіла і моц на верхніх гуках і больш слабае гучанне нізкіх гукаў. Нізкі (цэнтр.) Б. вылучаецца глыбокім, поўным гучаннем у нізкім рэгістры і напружаным — у верхнім, дыяпазон (C, D) $E—d^1$ ($e^1$). Самы нізкі від Б. — т. зв. Б.-актавіст, дыяпазон ($A_1$) $B_1—a$ ($c_1$). 2) Муз. інструменты нізкага (басовага) рэгістра (туба, кантрабас, саксафон-Б., домра-Б., Б.-кларнет). 3) Самая нізкая партыя шматгалосага муз. твора.

**БАСАВЕ́Ц** Аўрам Мікалаевіч (н. 15.2.1934, в. Гарадная Столінскага р-на), беларускі народны майстар у галіне ганчарства. Патомны ганчар, навыкі рамяства пераняў у дзяцінстве ад мясц. майстроў. Працаваў як майстар-надомнік Пінскай фабрыкі маст. вырабаў «Крыніца Палесся». З 2003 выкладае ў Гараднянскім цэнтры ганчарства. Творчасць майстра дэманструе сучас-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ